# МЕТАДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ГРАМАТЫЧНАЙ АСНОВЫ СКАЗА І СЛОВАЗЛУЧЭННЯЎ У ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

Жук Марына Сяргееўна
УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна"

Першаснае ўяўленне пра граматычную аснову сказа вучні атрымліваюць у другім класе. У падручнікай па беларускай мове даецца вобразнае ўяўленне граматычнага ядра сказа: "Тата і мама – аснова сям'і", "Апоры (быкі) – аснова маста". Тут жа абагульняюцца прыметы асновы: словы, якія яе складаюць, адказваюць на пытанні пра каго? (пра што?) гаворыцца; што гаворыцца?

Вызначыць аснову другакласнікам дапамагаюць наступныя практыкаванні:

– пытанні (Хто выступае ў тэатры?);

– складанне сказаў аб канкрэтным прадмеце ці з'яве (Складзіце сказ пра сонейка);

– падбор па сэнсе элемента асновы, якога не хапае (Галодны воўк … (блукае? ходзіць? бегае?) па лесе).

Трэцякласнікі знаёмяцца з такімі паняццямі, як "дзейнік" , "выказнік", "галоўныя члены сказа", "даданыя члены сказа". Вучням трэба растлумачыць, што дзейнік – гэта прадмет, які ўтварае дзеянне. Ад яго можна паставіць пытанне *што робіць? (што рабіў? што будзе рабіць?)* Калі ж гэтае пытанне паставіць нельга, значыць, мы маем справу не з дзейнікам, а з дапаўненнем. Граматычны дзейнік можна зблытаць з псіхалагічным суб'ектам думкі. Не заўсёды вучні могуць сказаць, *пра каго, пра што* гаворыцца і *што* гаворыцца. Напрыклад, пры разборы сказа *"Весела адпачывалі дзеці ў лагеры"* вучні на пытанне *"Пра што гаворыцца ў гэтым сказе?"* адказваюць: "*Пра лагер*". А на пытанне *"Што гаворыцца?"* – адказваюць: *"Было весела"*.

Для аналізу не варта браць аднатыпныя сказы, у якіх дзейнік стаіць перад выказнікам, і сказы, у якіх дзейнік і выказнік аддзелены значнай колькасцю даданых членаў.

Пасля таго, як вучні навучыліся выдзяляць аснову сказа, яны даведваюцца, што галоўныя члены сказа разам са словамі, якія іх паясняюць, утвараюць *словазлучэнні.* У моўнай практыцы словазлучэнне выкарыстоўваецца толькі праз сказ. Вучні працуюць над словазлучэннем у складзе сказа, а таксама складаюць асобныя, ізаляваныя словазлучэнні, якія пасля можна ў яго ўвесці. Гэта значыць, практыкаванні могуць быць аналітычнымі і сінтэтычнымі. Абодва віды практыкаванняў выкарыстоўваюцца паралельна. Пры складанні словазлучэнняў найбольш

памылак вучні дапускаюць у дапасаванні і кіраванні. Таму карысна, каб у класе на відным месцы знаходзіўся слоўнік словазлучэнняў *(пайсці па ваду, дзякаваць сябру, смачныя маліны….*

Асноўныя практыкаванні і заданні, якія могуць выкарыстоўвацца, наступныя:

– пастаўце пытанні ад галоўных слоў да залежных;
– выпішыце словазлучэнні;
– пакажыце сувязь слоў схематычна;
– растлумачце, што абазначае данае словазлучэнне (калі гэта фразеалагізм);
– склададзіце словы з новымі словамі, што сустрэліся ў тэксце (гэта датычыцца ў першую чаргу слоўнікавых слоў);
– складзіце словазлучэнні па зададзеных мадэлях (назоўнік + прыметнік; дзеяслоў+прыназоўнік+назоўнік…).

Уменне ўстанаўліваць сувязь слоў у словазлучэннях вельмі важнае, бо забяспечвае правільнае вызначэнне склонаў назоўніка і членаў сказа. Яно выпрацоўваецца паступова, пачынаючы нават з першага класа. Спачатку вучні ставяць пытанні ад дзейніка да выказніка. Пасля ад галоўных членаў сказа да даданых.

Вучні павінны засвоіць, што:

– словы ў сказах звязаны парамі, прычым неабавязкова словы, што ўтвараюць пару, стаяць побач;
– пытанні ставяцца ад галоўнага слова да залежнага;
– паралельна могуць ужывацца сэнсавыя і склонавыя пытанні.

Фарміраванню ўмення знаходзіць сувязь слоў у сказе дапамагае графічнае мадэліраванне. Пры гэтым неабавязкова браць словы ў прамавугольнікі. Каб стрэлкі не перасякаліся, словы сказа можна запісаць у слупок.

*На лясных*
*палянах*
*з’явіліся*
*першыя*
*пралескі.*

Стрэлкі можна правесці як з правага, так і з левага боку.

Уменне вызначаць граматычную аснову сказа, вылучаць з яго словазлучэнні і складаць сказы на аснове словазлучэнняў надзвычай важнае, бо гэта аснова для далейшага засваення ведаў па сінтаксісе і граматыцы.